# Памёр Уладзімір Пузыня

18 верасня ранкам пайшоў з жыцця славуты беларускі музыка, майстар старажытных народных інструментаў Уладзімір Пузыня. Яму было 72 гады.

Пра свайго настаўніка гаворыць лідар гурту "Стары Ольса" Зміцер Сасноўскі:

- Уладзімір Пузыня быў сімвалам, які звязваў аж тры пакаленьні музыкаў. Гэта тое пакаленне - Цітовіч, Лычкоўскі, Жукоўскі, - якія выраблялі народныя інструменты, адраджалі і вярталі з нябыту, у які тыя трапілі ў першай палове XX стагоддзя. Другое пакаленне - музыкі 80-90-х гадоў. І, нарэшце, гэта настаўнік для тых, хто граў на народных інструментах. Уладзімір Пузыня да гэтага моманту быў старэйшым жывым майстрам, які выробляў такі сімвалічны для Беларусі інструмент, як дуда. Мы рэгулярна запрашалі яго на дударскі фэст, на канферэнцыі. Толькі аднойчы за апошнія шэсць год ён выйшаў і граў на сцэне, бо ў яго было кепскае здароўе. Але ён заставаўся сімвалам. Сімвалам, які звязваў настолькі розныя часы і настолькі розных людзей.



Нарадзіўся Ўладзімір Пузыня 26 лютага 1940 году ў вёсцы Суцін на Любаншчыне. Паходзіў са шляхецкага роду. У Магілёве скончыў школу мастацтваў, дзе вучыўся рэстаўрацыі. А ўжо ў 70-я пачаў сам рабіць старажытныя інструменты - дуды, ліры.

Ужо ў 80-я гады пашанцавала шмат якім маладым музыкам, якія траплялі да яго ў "Беларускую хатку". Гэтую лабараторыю адраджэння і вырабу беларускіх народных інструментаў Уладзімір Пузыня стварыў пры менскім Інстытуце культуры, дзе ў той час выкладаў.

Сучасную беларускую музыку ўжо немагчыма ўявіць сабе без старажытных народных інструментаў. Гучанне шмат якіх гуртоў стала ўнікальным і пазнавальным дзякуючы інструментам Уладзіміра Пузыні.

Вечная памяць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ